# ТУРЫСЦКА-ЭКСКУРСІЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ГОРАДА ВІЦЕБСКА

***У.І. Ткачэнка***
(Навуковы кіраўнік: к.э.н, дацэнт Шаховіч С.В.)

Адным з прыярытэтных накірункаў у беларускай гаспадарцы сёння з'яўляецца развіццё турызму. Асаблівы акцэнт робіцца на развіццё язднога турызма, гэта значыць павілічэнне колькасці замежных турыстаў, якія б наведвалі нашу краіну. Пры гэтым чамусьці большая ўвага надаецца аграрнаму, ці селькаму, турызму. Але ж, і пазнавальны турызм у дадзенай галіне мае шырокія перспектывы. Разгледзем гэта на прыкладзе горада Віцебска.

Віцебск – адзін з самых старажытных беларускіх гарадоў. Сёння гэта абласны цэнтр з насельніцтвам каля 350 тысяч чалавек. На вялікі

жаль, сёння на вуліцах Віцебска не пабачыш шматлікіх турыстычных груп, не асабліва часта пачуеш замежнае слова. Але ж горад валодае вялікім турысцка-экскурсійным патэнцыялам, што дазваляе спадзявацца на ператварэнне ў будучыні Віцебска ў адзін з самых значных турыстычных цэнтраў нашай краіны.

Сёння робяцца пэўныя крокі па адраджэнні гістарычнага цэнтра горада. Так, яшчэ ў 1998 годзе быў адноўлены адзін з самых старажытных храмаў Беларусі – Дабравешчанская царква 12 стагоддзя, узарваная ў 1961 годзе. Зараз ідзе адбудова двух храмаў 18 стагоддзя – Васкрасенскай (Рынкавай) царквы і Успенскага сабора. Гэтыя культавыя пабудовы былі знішчаны бальшавікамі ў 1930-я гады, але ж у хуткім часе яны зноўку будуць радаваць вока жыхароў і гасцёў горада. Акрамя таго, у Віцебску захавалася шэраг архітэктурных помнікаў: гарадская ратуша, губерна-тарскі палац, касцёл Святой Барбары, Пакроўскі сабор, помнік героям вайны 1812 г., забудова 19 – пачатку 20 стагоддзяў па вуліцы Суворава і г.д. Дарэчы, маюцца планы па стварэнні пешаходнай зоны ў старым го-радзе ( вуліца Суворава).

У горадзе маецца вялікая колькасць музеяў. На вялікі жаль, не кожны з іх адпавядае часу, у некаторых дзесяцігоддзямі не праводзілася змена экспазіцый (так, экспазіцыя Музея Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова не змянялася амаль 40 гадоў). Але ж маюцца музеі, якія без-умоўна зацікавяць замежных турыстаў. У гэтым сэнсе найбольш цікавым сёння напэўна з'яўляецца Дом-музей Марка Шагала, размешчаны у доме, дзе прайшло дзяцінства і юнацтва сусветна вядомага мастака. Цікавыя экспазіцыі прадстаўлены ў Віцебскім краязнаўчым музеі (размешчаны ў будынку ратушы 18 стагоддзя), музеі прыватных калекцый (размешчаны ў гарадскім асабняку канца 19 стагоддзя), Літаратурным музеі (размешчаны ў будынку першай віцебскай электрастанцыі). Вялікае эмацыянальнае ўздзеянне мае Музей войнаў-інтэрнацыяналістаў. Безумоўна цікавым будзе наведванне музея-сядзібы сусветнавядомага рускага мастака І.Я. Рэпіна Здраўнёва, што размешчана ў ваколіцах горада.

Віцебск нездарма часам называюць культурнай сталіцай Беларусі. Тут штогод праводзіцца шэраг міжнародных фестываляў. Найбольш папулярным з іх з'яўляецца Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску", які праводзіцца штогод пачынаючы з 1992 года. За гады правядзення фестываля ў ім бралі ўдзел спевакі, музыкі, мастакі, літаратары, кінаматаграфісты з 43 краінаў свету. У 2007 годзе была праведзена вялікая рэканструкцыя галоўнай пляцоўкі фестываля – Летняга амфітэатра, у выніку якой была значна павялічана колькасць месцаў для гледачоў і ўзведзены дах над глядзельнай залай. Таксама адбылося сімвалічнае аднаўленне адной з вежаў віцебскага замка, якая знаходзілася каля сучаснага амфітэатра. Вялікую цікавасць выклікаюць таксама Міжнародныя Шагалаўскія дні, Міжнародны музычны фестываль імя І.І. Салертынскага, Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі (IFMC).

Безумоўна важным пытаннем для турыстычнага цэнтра з'яўляецца наяўнасць гатэляў адпаведнага узроўню. У Віцебску з сямі гатэляў толькі два маюць зоркавыя катэгорыі., Іншыя гатэлі Віцебска не адпавядаюць міжнароднаму ўзроўню (за выключэннем хіба што невялікага прыватнага

гатэля, размешчанага ў культурна-забаўляльным цэнтры "Золотой телёнок").

Важным момантам з'яўляецца наяўнасць месцаў, дзе можна бавіць вольны час. У гэтым сэнсе у горадзе за апошні час зроблены пэўныя крокі наперад. З'явілася некалькі новых кафе, клубаў, кальтурна-забаўляльных цэнтраў. Праведзена рэканструкцыя і ўсталявана сучасная апаратура ў кінатэатах "Мір" і "Дом кіно". У перспектыве плануецца стварэнне ля Летняга амфітэатра вялікага забаўляльнага цэнтра. Напэўна, гэта будзе сучасны будынак у выглядзе вялікай шкляной пірамiды. На ніжнім узроўні размесціцца боўлінг, інтэрнэт-кафэ, міні-аквапарк,фітнэс-зала. На другім узроўні – басейн, каскад фантанаў. А па перыметры азмесцяццарэстараны, крамы, салоны прыгажосці, дзіцячыя забаўляльныя комплексы, кіназала. Трэба памятаць і пра тое, што ў Віцебску знаходзіцца адзін са арэйшых тэатраў Беларусі – Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа.